В.М.Ушакова,
*доктар педагагічных навук*
Р.Ф.Шаура,
*кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар*

# ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

У якасці прыярытэтнай праграмы ў цывілізаванай дзяржаве выступае сацыяльны заказ на падрыхтоўку спецыялістаў, які, у сваю чаргу, з'яўляецца асновай функцыянавання сістэмы адукацыі. Сёння неабходна заканадаўчае абгрунтаванне рэалізацыі любой доўгатэрміновай дзяржаўнай праграмы. Аднак трэба адзначыць, што пакуль яшчэ адсутнічаюць у краіне агульныя эканамічныя, прававыя, арганізацыйныя прынцыпы і палажэнні фарміравання, размяшчэння і выканання на доўгатэрміновай аснове заказаў на сацыяльныя праграмы, што ўплывае на эфектыўнасць іх рэалізацыі.

У другой палове XX ст. у сістэме адукацыі адбыліся істотныя змены, што абумоўлена шэрагам прычын рознага характару: культуралагічнага, сацыяльна-эканамічнага, экалагічнага і асобаснага. З'явіліся канцэпцыі вольнага навучання, бесперапыннай адукацыі, гуманітарызацыі адукацыі, умацоўваецца ідэя аб ролі чалавека ў сваім асабістым развіцці. Найбольшую папулярнасць набыла тэорыя бесперапыннай адукацыі (В.С.Абасава, М.А.Аітаў, А.П.Уладзіслаўлеў, Б.С.Гершунскі, М.І.Латыш, А.І.Ляўко, А.Ц.Растуноў і інш.). Прынцып бесперапыннасці адукацыі разглядаецца ў якасці асноватворнага ва ўсіх нарматыўных дакументах, якія рэгламентуюць дзейнасць сістэмы адукацыі.

Разам з традыцыйнымі сёння складваюцца новыя ўяўленні аб чалавеку і адукаванасці, разуменні і прыняцці культурных традыцый і каштоўнасцей. Яны сведчаць аб неабходнасці рэформаў у адукацыі. Іх поспех у многім



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

залежыць ад таго, наколькі ўдаецца інтэрпрэтаваць новыя тэндэнцыі ў рэальнай сітуацыі.

Працэсы трансфармацыі грамадства, якія адбываюцца ў краіне, пераход да новых эканамічных адносін выклікалі адпаведныя змены грамадскай думкі: адбыўся перанос акцэнтаў у фарміраванні асобы на агульначалавечыя каштоўнасці (гуманізм, духоўнасць, традыцыі, культура), што абумовіла пастаноўку новай адукацыйнай парадыгмы — асабіста арыентаванай, станаўленне якой у большасці краін свету ажыццяўляецца праз рэалізацыю культуралагічнай парадыгмы. У такіх умовах узнікаюць новыя патрабаванні да падрыхтоўкі спецыялістаў.

Сёння на рынку працы патрэбны спецыялісты, якія валодаюць не толькі прафесіяналізмам, але і высокім узроўнем агульнай культуры. Пры гэтым узнікаюць навучальныя ўстановы, арыентаваныя на павышаны ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў, развіццё іх здольнасцей да канкурэнцыі на рынку працы.

Ажыццяўляць рэформы ў сістэме бесперапыннай адукацыі мэтазгодна на аснове вертыкальнай інтэграцыі адукацыйных структур розных ступеней падрыхтоўкі спецыялістаў. Сутнасць яе заключаецца ў арганізацыйнай, метадалагічнай, дыдактычнай узаемасувязі, пераемнасці сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Сістэма бесперапыннай многаступеннай адукацыі рэалізуецца шляхам увядзення ў структуру ўніверсітэтаў шматлікіх каледжаў. У далейшым мяркуецца развіццё такіх структур за кошт паглыблення інтэграцыі па вертыкалі з іншымі навучальнымі ўстановамі: гімназіямі, ліцэямі, агульнаадукацыйнымі школамі, прафесійнымі навучальнымі ўстановамі рознага ўзроўню.

Спасціжэнне нацыянальных і прафесійных асноў культуры ў працэсе навучання, дэмакратызацыя вучэбнага працэсу, гуманітарызацыя за кошт выкладання шырокага спектра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін дазваляюць навучэнцам асэнсавана падысці да выбару ўзроўню навучання і атрымання адпаведнай кваліфікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зараз навучальныя ўстановы рознага тыпу могуць укараняцца ў структуру універсітэта культуры і станавіцца асновай для далейшай інтэграцыі адукацыйнай сістэмы па вертыкалі. Адзіная базавая падрыхтоўка ў такой сістэме забяспечвае прастор пры далейшай яе індывідуалізацыі. Асноўным крытэрыем пераходу на тую ці іншую ступень падрыхтоўкі з'яўляюцца творчыя здольнасці навучэнцаў.

Адсутнасць на сённяшні дзень канкрэтных тэарэтычных, метадычных напрацовак дае падставы прапанаваць мноства пераходных варыянтаў рэалізацыі гэтай ідэі, таму важна вызначыць агульныя падыходы, аб'ектыўныя перадумовы ажыццяўлення дадзенага працэсу. У кантэксце такога вопыту мэтазгодна сфармуляваць асобныя канцэптуальныя палажэнні, якія неабходна ўлічваць пры канструяванні сістэмы бесперапыннай адукацыі. На бесперапынную падрыхтоўку спецыялістаў уплываюць наступныя фактары:

— рэгіянальныя ўмовы развіцця сістэмы адукацыі;

— развіццё новых тыпаў і відаў навучальных устаноў;

— аб'яднанне ў сістэму бесперапыннай адукацыі ўсіх тыпаў навучальных устаноў;

— пераемнасць у рашэнні арганізацыйных, навукова-метадычных задач;

— рэалізацыя дагаворных адносін паміж навучальнымі ўстановамі;

— удасканаленне метадалагічнай базы сістэмы бесперапыннай адукацыі;

— распрацоўка нарматыўна-метадычнага эабеспячэння сістэмы бесперапыннай адукацыі.

Такім чынам, сацыяльны заказ грамадства на падрыхтоўку спецыялістаў, яго якасныя аспекты з'яўляюцца асновай функцыянавання сістэмы адукацыі ў цэлым і замацоўваюць новыя ўстойлівыя тэндэнцыі развіцця грамадства. Кірункі, маштабы развіцця пэўных з'яў і працэсаў, у сваю чаргу, вызначаюць адпаведныя мерапрыемствы і заканадаўчую сутнасць рэалізацыі сацыяльных праграм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ